# Аўтэнтычны фальклор як крыніца патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі

**В. С. Новак,**
загадчык кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны,
доктар філалагічных навук, прафесар

*Клопаты аб захаванні і развіцці духоўнай культуры беларускага народа – прыярытэтны напрамак дзяржаўнай палітыкі ў галіне ідэалагічнай і выхаваўчай работы. Менавіта з выхаваннем духоўнасці звязана станаўленне дзяржаўнасці, а высокі ўзровень развіцця культуры – важная ўмова выхавання грамадзяніна-патрыёта, які павінен ведаць традыцыі, абрады, звычаі і песні сваіх продкаў і захоўваць іх як культурную спадчыну. «Патрыятызм – гэта сфарміраваная скіраванасць асобы адносна сваёй Радзімы – месца, дзе нарадзіўся і вырас чалавек, а іншы раз і Айчыны як сацыяльна-палітычнай з'явы, звязанай з грамадскімі адносінамі, палітычным і эканамічным ладам, гісторыяй, канкрэтным прыродным, матэрыяльным і сацыякультурным асяроддзем» [2, с. 117].*

Адной з мэт патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі з'яўляецца захаванне асноў этнічнай самабытнасці. У гэтых адносінах аўтэнтычны фальклор беларусаў – выдатная крыніца адлюстравання народных уяўленняў пра патрыятызм як пра любоў да роднай зямлі, свайго народа, звычаяў і абрадаў, роднай мовы, гісторыі. У Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны задачы грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі на філалагічным факультэце вырашаюцца ў пэўнай сістэме і комплексна на аснове аўтэнтычных фальклорна-этнаграфічных і міфалагічных матэрыялаў, архіўных, апублікаваных і палявых экспедыцыйных. Нельга выхаваць грамадзяніна-патрыёта без глыбокага ведання ім духоўнай культуры свайго народа, яго этычных і эстэтычных установак і ўяўленняў. У гэтай сувязі заслугоўваюць увагі разважанні літаратуразнаўцы В. Максімовіча, які слушна адзначае, што *«спрычыненасць да агульнапрынятых прынцыпаў і норм, перакананняў і ідэй, якія складаюць аснову грамадскай структуры, дазваляе сцэментаваць, злучыць у адзінае цэлае розныя часткі сацыяльнага арганізма, кансалідаваць грамадства, актывізаваць працэс нацыянальнай ідэнтыфікацыі, а тым самым і дасягнуць духоўнага адзінства»* [1, с. 145].

Лекцыйныя і практычныя заняткі па дысцыплінах *«Фалькларыстыка», «Славянская міфалогія»*, правядзенне фальклорна-краязнаўчай практыкі ў палявых умовах, падрыхтоўка студэнтамі творчых прэзентацый па духоўнай культуры асобных раёнаў Гомельшчыны і іншых рэгіёнаў Беларусі, штогадовыя вучэбна-практычныя канферэнцыі, на якіх падводзяцца вынікі фальклорна-краязнаўчай практыкі і студэнты-першакурснікі знаёмяцца з методыкай запісу і прынцыпамі камеральнай апрацоўкі фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, сцэнізацыя фальклорных святаў і абрадаў у студэнцкіх аўдыторыях, бібліятэках і школах Гомеля, непасрэдны ўдзел студэнтаў як збіральнікаў народна-паэтычных скарбаў пры складанні фальклорна-этнаграфічных зборнікаў па духоўнай культуры асобных раёнаў Гомельшчыны – важныя формы вучэбнага працэсу, што ставяць на мэце выхаванне студэнтаў-філолагаў сапраўднымі грамадзянамі-патрыётамі.

У адукацыйнай прасторы сучаснай вышэйшай школы важнае месца адводзіцца лекцыйным і практычным заняткам. Выкладчыкі-фалькларысты, выкладаючы вучэбны праграмны матэрыял, павінны ўзбагачаць змест сваіх лекцый цікавымі практычнымі ілюстрацыямі, узятымі не толькі з апублікаваных выданняў, але і ўласна запісанымі ў палявых экспедыцыях, каб натхніць і далучыць моладзь да высакароднай працы на ніве збірання, адраджэння, захавання і прапаганды фальклорных традыцый, якія з'яўляюцца асновай духоўнага жыцця нацыі.

Важная задача выкладчыкаў-фалькларыстаў – данесці да студэнтаў важнасць самой ідэі захавання і адраджэння нацыянальнай культуры, што немагчыма без глыбокага ведання яе відаў як на агульнаэтнічным, так і рэгіянальна-лакальным узроўнях.

У сувязі з гэтым тэзіс *«Усё вялікае пачынаецца з малога»* (любоў да роднага краю спалучаецца з любоўю да малой радзімы) гучыць надзвычай актуальна пры вырашэнні на лекцыях і практычных занятках, прысвечаных знаёмству з рознымі фальклорнымі жанрамі, задач выхавання пачуцця патрыятызму.

Каб пераканацца ў тым, што ўяўленні пра каштоўнасць, прыгажосць і адметнасць усяго роднага, уласцівага свайму народу, – аснова выхавання

пачуццяў чалавечай годнасці і гонару за свой народ, звернемся да тых цікавых палявых матэрыялаў, якія, напрыклад, мне як выкладчыку-фальклярысту даводзілася ўключаць у змест лекцыі па зімовай каляндарна-абрадавай паэзіі. Пасля таго як студэнты пазнаёмяцца са структурай агульнаэтнічнага, калядна-навагодняга комплексу, прапануюцца звесткі рэгіянальна-лакальнага характару, запісаныя ў палявых экспедыцыях на тэрыторыі Гомельшчыны, з мэтай зацікавіць непаўторным багаццем абрадаў і звычаяў, натхніць на запіс уласных звестак у розных мясцовасцях.

У прыватнасці, надзвычай багатая калядна-навагодняя абраднасць і паэзія Лоеўшчыны. У структуры святкавання Каляд важнае месца адводзілася рытуалам, звязаным з першай, другой і трэцяй куццёй. Як і ў іншых мясцовасцях Гомельшчыны, лаяўчане варылі кашу: *«всягда з ячменя»* (г. п. Лоеў); куццю *«варылі з розных круп: ілі аўсянка, ілі пшано, ілі грэчка, ілі пярловая крупа»* (в. Гарадок); *«рабіла куццю свежанькую, з пшана варыла»* (п. Пабядзіцель) і інш. Гаршчок з кашай абавязкова ставілі на сена, бо, падкрэсліваюць інфарматары, *«Ісус радзіўся на сене»*. З цікавай інтэрпрэтацыяй вобраза павука звязваюць мясцовыя жыхары міфалагічны матыў спасення Хрыста: *«І кажуць, што яго* (Хрыста. – *В. Н.*) *ужо іскалі, павук заснаваў тое месца павуціннем»*. Гэтым і матывуецца прыкмета аб тым, што *«павука біць нельзя, а еслі павук паўзе, то нада зняць і выкінуць»*. Прыведзеныя народныя ўяўленні, звязаныя з павуком, які надзелены касмалагічнай сімволікай, абумоўлены яго роляй як дэміурга.

Рытуал загукання марозу выконвалі як магічны акт яго заклікання не марозіць пасевы, не шкодзіць ураджайнасці палёў. У в. Крупейкі Лоеўскага раёна загуканне марозу мела выразна акрэсленую славесную формулу: *«Мароз, Мароз, не хадзі летам, а хадзі зімою. А як летам прыдзеш, дык будзем біць жалезнай пугаю»*.

Пра рытуал заклінання неўрадлівага дрэва, блізкі да ўкраінскага звычаю, прыгадвалі многія жыхары Лоеўшчыны: Таццяна Міхееўна Пруднік 1918 г. н. з в. Казярогі: *«Яблыні ж сакірай (сякерай) страшаць, штоб яблыкі радзілі»*; Вольга Мікіцічна Кардаш 1927 г. н. з г. п. Лоеў: *«А падходзіш к яблыне з тапорыкам да кажаш: “Не будзеш пладаносіць – ссяку цябе. Глядзіш, на следуюшчы год усё добра”»*. Рытуал абвязвання пладовых дрэў сенам, якое ляжала падчас калядных святкаванняў на стале, павінен быў таксама садзейнічаць іх ураджайнасці: *«Каб радзілі яблакі і грушы»* (в. Крупейкі).

У мясцовым калядна-навагоднім абрадавым комплексе былі вядомы абрад ваджэння казы і звычай хаджэння з мядзведзем. Арганічную частку калядна-навагодняй абраднасці ў розных вёсках Добрушскага раёна складаюць рытуальныя дыялогі, сярод якіх найбольш распаўсюджаным быў звычай заклікання марозу. Напрыклад, у в. Ігаўка быў звычай заклікаць мароз на першую куццю. Ён меў своеасаблівую мясцовую форму: маці прымушала хлопцаў залезці пад стол і адтуль крычаць: *«Мароз, мароз, прыходзь куццю есць і не марозь нічога ў нас...»* (запісана ад Еўдакіі Фёдараўны Драганавай 1919 г. н.). Калядоўшчыкі ў гэтай вёсцы пачыналі абходныя шэсці *«на Новы год, пад 13 студзеня, дзелалі фанары з буракоў, унутры ўсё выразалі і ставілі туды свечку. Гэты бурак свяціўся. А дзелалі гэта для таго, каб бачылі, што ідуць калядоўшчыкі»* (запісана ад Еўдакіі Фёдараўны Драганавай).

У абрадзе калядавання ў в. Вадовічы Калінкавіцкага раёна ўдзельнічалі, акрамя дзеда-павадыра з казой, і іншыя маскі. Напрыклад, *«хто з маскай каня ходзіць, у форму салдата апранецца, у дзеда і бабу»*. Калі маска «каня» – адметнасць мясцовай каляднай традыцыі в. Вадовічы, то зроблены з саломы павук, упрыгожаны сухімі кветкамі і пакладзены пад ікону на кут, – гэта лакальная дэталь у цырымоніі святкавання другой куцці ў в. Сырод Калінкавіцкага раёна. Наданнем павуку магічных уласцівасцей ахоўніка ў мясцовай народнай міфалагічнай традыцыі можна растлумачыць, чаму з такой пашанай адносіліся мясцовыя жыхары да саламяных павукоў напярэдадні Калядаў і вешаць іх *«на шчасце ў покуце над сталом»*. Адметным у мясцовай каляднай традыцыі быў факт прысутнасці падчас калядавання абрадавага дрэўца – елкі (*«мы делалі ёлку, цветы с бумагі делали на ёлку, это так её украшали»* (запісана ў в. Дудзічы ад Вольгі Уладзіміраўны Савянок 1929 г. н.). Паколькі ўдзельнікі абраду калядавання сімвалізавалі духаў памерлых, то і выкарыстанне елкі як дрэва, звязанага са светам памерлых, невыпадковае.

Паводле ўспамінаў мясцовых жыхароў, *«хадзілі на Каляды і з “царыцай”»*. *«Царыцу адзявалі і наклейвалі бумагі, раскрашывалі іх. Хадзілі па хатах. Хлопец спрашваў, ці можна зайці. Песні спявалі. А ў канцы царыца памірала па старасці. Казалі: “Памерла наша царыца”. Яе клалі на саблі і выносілі. За ета ім давалі пірагі, калбасу, яду»* (в. Вялікія Аўцюкі). Выконвалі гэты абрад толькі мужчыны, і адбываўся ён адначасова з *«нашэннем звязды»*. Самі інфарматары не здолелі патлумачыць семантыку гэтых абрадавых дзеянняў, якія па характары выканання надзвычай блізкія да каляднай нябожчыцкай гульні *«Памярла наша Мальвіна, памярла»*.

Абрады ваджэння казы і хаджэння са звяздой сведчаць аб непарыўнай сувязі язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў: *«Хлопцы з казою хадзілі ў каждую хату, звязду насілі. У ёй унутры свяча гарэла, а на самой біблейскія малюнкі былі:*

*За гарою за крутою*
*Ходзяць хлопцы са звяздою,*
*Наша звязда не простая,*
*Увесь мір украшае»*
(в. Рудня Антонаўская).

З хрысціянскімі матывамі звязаны і рытуал заклікання марозу, выконваючы які, гаспадар з куццёй тройчы абыходзіў хату, *«стукаў у акно, а гаспадыня пытала: "Хто стукае?" Ён адказваў: "Сам Бог стукае з цёплай вясной, з гарачым летам, з багатай восенню"»* (в. Есіпава Рудня). Зварот да Бога ў дадзеным кантэксце складае аснову прыведзенай славеснай формулы і сведчыць аб добрай захаванасці рэлігійных традыцый у вуснай памяці, аб іх адаптацыі да сучаснасці.

Маляванне крыжоў на дзвярах і вокнах на трэцюю куццю таксама сведчыць аб узаемадзеянні язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў.

Знаёмства студэнтаў з вышэйпрыведзенымі мясцовымі асаблівасцямі абраду калядавання не толькі дапамагае абудзіць у іх цікавасць да запісу звестак пра Каляды ад сваіх бабуль, дзядуль і бацькоў, але і дазваляе зразумець тэарэтычную выснову аб тым, што фальклор як від мастацтва, які мае агульнанародны характар і адлюстроўвае агульныя для ўсяго народа погляды, ідэалы, імкненні, спадзяванні, глыбока патрыятычны па змесце і бытуе на мясцовым узроўні.

Як правіла, на філалагічным факультэце ГомДУ навучаюцца ў асноўным студэнты з розных раёнаў Гомельшчыны, таму і геаграфія палявых фальклорна-краязнаўчых даследаванняў звязана з раёнамі Гомельшчыны. Аднак у 2008 г. студэнты-філолагі праходзілі фальклорную практыку ў розных вёсках Лагойскага раёна Мінскай вобласці. Збіранне студэнтамі фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў у розных мясцовасцях падчас калектыўных палявых экспедыцый і індывідуальных паездак – важны момант у далучэнні да працэсу спасціжэння духоўнай культуры роднай вёскі, гарадскога пасёлка, горада, а гутаркі з жыхарамі, уласныя назіранні, успаміны і ацэнкі тых ці іншых традыцый з пункту гледжання носьбітаў-захавальнікаў фальклору і міфалогіі надзвычай каштоўныя для фарміравання пачуцця павагі і любові да малой радзімы.

Сабраныя студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі і выкладчыкамі палявыя матэрыялы, звязаныя з абрадамі і звычаямі, а таксама сфарміраваныя ў экспедыцыях уяўленні пра каштоўнасць, прыгажосць і адметнасці ўсяго роднага, уласцівага той ці іншай мясцовасці, – аснова выхавання пачуццяў годнасці і гонару за свой народ. Як падкрэсліла беларуская фалькларыстка Г. А. Барташэвіч, *«клопат аб захаванні і перадачы ўсяго, што складае народнае быццё, запаветы дзядоў, – важкі грунт патрыятычнага выхавання»* [3, с. 9]. Падкрэслім, што кожная палявая экспедыцыя падчас правядзення вучэбнай фальклорна-краязнаўчай практыкі – гэта не толькі экзамен на веды, атрыманыя пры выкладанні дысцыплін *«Фалькларыстыка», «Славянская міфалогія»*, але і на чалавечнасць, грамадзянскую сталасць. Кожная сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў з вяскоўцамі і гараджанамі-інфарматарамі выяўляе індывідуальныя лёсы апошніх, іх высокі маральна-этычны патэнцыял, раскрывае светапогляд, пераконвае ў мудрасці народнай жыццёвай філасофіі, аптымізме. Многія разважанні тых сціплых людзей, з якімі даводзілася гутарыць студэнтам і выкладчыкам падчас запісаў звестак пра колішнія абрады, звычаі і песні, здзіўлялі шчырасцю, назіральнасцю, глыбінёй думкі і пачуцця, філасофскім сэнсам. Напрыклад, асабліва запомніўся студэнтам адказ адной з жыхарак Калінкавіцкага раёна на пытанне, з якой мэтай упрыгожвалі зелянінай падвор'і: *«Мы радасці ў жыцці шукалі»*. Уразілі і разважанні вяскоўцаў наконт цяжкага канання ў іх мясцовасці жанчыны, якая скідвалася раз-пораз ведзьмай: *«Смерць, дзеткі, заслужыць трэба»*. З вялікай цікавасцю ўспрымалі студэнты расповеды жыхароў Калінкавіцкага раёна аб тым, як, напрыклад, у іх мясцовасці выклікалі дождж (*«12 баб-удоў цягалі плуг на дарозе, кідалі куўшыны ў калодзеж», «у калодзезь кідалі ступу, якую ўкралі»* і інш.), як варажылі даўней на шлюб (*«Кідалі вянкі з галавы ў раку, так было правільней... Калі плывуць, то добра; калі патоне вянок, то ўтопіцца дзяўчына або замуж не пойдзе»*), з якой мэтай выкарыстоўвалі засушаныя кляновыя галінкі, якімі на Тройцу ўпрыгожвалі хату і падвор'е (*«Ад мышэй сушаныя клёнікі выкарыстоўвалі»*).

Варта падкрэсліць, што надзвычай важнае значэнне ў вучэбным працэсе для студэнтаў-першакурснікаў маюць тыя практычныя канферэнцыі, якія наладжваюцца на філалагічным факультэце кафедрай беларускай культуры і фалькларыстыкі. Звычайна на гэтым мерапрыемстве адбываецца творчая прэзентацыя вынікаў праведзенай фальклорна-краязнаўчай практыкі, пры гэтым дэманструюцца адпаведныя фотаілюстрацыі значных экспедыцыйных з'яў і фотапартрэты носьбітаў фальклорных традыцый. Студэнты і выкладчыкі дзеляцца сваімі ўспамінамі і ўражаннямі, увага студэнцкай аўдыторыі засяроджваецца на шматлікіх важных момантах непасрэднай працы з інфарматарамі, на тым, як правільна весці гутарку, фіксаваць матэрыялы, вызначаць іх жанры, праводзіць асцярожную камеральную апрацоўку запісаных звестак і г. д. Удзельнікі вучэбна-практычнай канферэнцыі даводзяць да ўвагі студэнтаў высокую значнасць іх будучай дзейнасці як фалькларыстаў-збіральнікаў падчас правядзення летняй фальклорна-краязнаўчай практыкі, бо ад

якасці запісу матэрыялаў залежаць іх каштоўнасць захавання ў архіве навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі, а таксама перспектыва выкарыстання падчас напісання дыпломных, магістарскіх і кандыдацкіх дысертацыйных даследаванняў, падрыхтоўкі на аснове аўтэнтычных палявых матэрыялаў сцэнарыяў фальклорных святаў і абрадаў, што могуць быць запатрабаванымі і падчас педагагічнай практыкі, і ў будучай прафесійнай дзейнасці.

Сапраўднае народнае выхаванне немагчыма без ведання і выкарыстання ў практычнай дзейнасці багатых фальклорных скарбаў. У гэтых адносінах важнае значэнне набывае правядзенне святаў на глебе мясцовага фальклору, падрыхтоўкай сцэнарыяў якіх з энтузіязмам і вялікім задавальненнем займаюцца студэнты-філолагі: як першакурснікі, так і студэнты іншых курсаў філалагічнага факультэта, а таксама запрашаюцца да ўдзелу ў творчых імправізаваных сцэнах студэнты іншых факультэтаў універсітэта.

Адзначым, што і такая форма далучэння студэнтаў да народнай традыцыйнай культуры надзвычай важная для фарміравання павагі да гістарычнага мінулага нашага народа, выхавання цікавасці да традыцый роднага краю. Звычайна студэнты, калі ім прапануецца такі творчы від арганізацыі іх дасугавай калектыўнай дзейнасці, з ахвотай складаюць сцэнарыі фальклорных святаў і абрадаў, выкарыстоўваючы аўтэнтычныя матэрыялы палявых экспедыцыйных даследаванняў і індывідуальныя запісы фальклорна-этнаграфічных звестак, зробленыя ў сваіх мясцовасцях. Студэнты ўлічваюць пэўныя патрабаванні, якія датычаць сцэнізацыі той ці іншай абрадавай з'явы, пазбягаюць штучнасці і эклектычнага спалучэння традыцый розных рэгіёнаў пры напісанні сцэнарыя, імкнуцца глыбока вывучыць фальклорна-этнаграфічныя традыцыі той ці іншай мясцовасці і правільна прадставіць, напрыклад, структуру вяселля або калядна-навагодняга комплексу таго ці іншага рэгіёна, улічыўшы пры гэтым багацце рэгіянальна-лакальных праяў абрадавых з'яў. Удзел студэнтаў у гэтым творчым працэсе ўзнаўлення на сцэне колішніх абрадаў і іх свядомае імкненне захаваць пры гэтым іх мясцовую аснову, несумненна, дапамагае глыбей спасцігнуць першасную крынічную прыгажосць мясцовага фальклору, забяспечыць пераемнасць самабытнай культуры, гарманізаваць адносіны паміж пакаленнямі. Студэнты, працуючы над складаннем сцэнарыяў народных святкаванняў, усведамляюць, як важна сур'ёзна адносіцца да фіксацыі тэкстаў і мелодый песень, скрупулёзна запісваць звесткі па абрадах і звычаях, ашчадна захоўваючы пры гэтым асаблівасці мясцовай гаворкі.

На філалагічным факультэце ГомДУ праводзіцца мэтанакіраваная работа па зборы, даследаванні, захаванні і папулярызацыі матэрыялаў народнай духоўнай культуры, паспяхова рэалізуецца канцэпцыя рэгіянальна-лакальнага вывучэння фальклору Гомельшчыны. На працягу апошніх дзесяці гадоў пры фінансавай падтрымцы раённых і абласнога выканаўчых камітэтаў выдадзены кнігі па духоўнай культуры Кармянскага, Рэчыцкага, Гомельскага, Буда-Кашалёўскага, Веткаўскага, Хойніцкага, Лоеўскага, Добрушскага, Чачэрскага, Жлобінскага, Брагінскага раёнаў Гомельскай вобласці і горада Мазыра. Падрыхтаваныя да выдання рукапісы кніг па фальклорна-этнаграфічнай спадчыне Рагачоўскага, Калінкавіцкага, Жыткавіцкага, Петрыкаўскага раёнаў Гомельскай вобласці, а таксама рукапісы дзвюх кніг па духоўнай культуры Лагойскага раёна Мінскай вобласці. Аснову названых выданняў складаюць аўтэнтычныя матэрыялы, запісаныя ў палявых экспедыцыях студэнтамі і выкладчыкамі, а таксама асобныя індывідуальныя запісы, зробленыя энтузіястамі ў сваіх родных мясцовасцях. Названыя кнігі сведчаць аб высокай грамадзянска-патрыятычнай місіі ўсіх, у тым ліку і студэнтаў, хто шчыра далучыўся і спрычыніўся душой і сэрцам да збірання і даследавання вусна-паэтычных скарбаў свайго народа. А. Якабсон, будучы старшынёй Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта, трапна адзначыў у артыкуле, напісаным з нагоды святкавання Дня беларускага пісьменства ў г. Хойнікі, што *«без апоры на высокую культуру мы не зможам выхаваць грамадзяніна-патрыёта, руплівага працаўніка, клапатлівага сем'яніна, творчую і духоўна багатую асобу. Духоўнасць – гэта найвышэйшая патрэбнасць, непарыўна звязаная з культурай у яе самым шырокім сэнсе. Мы павінны спрыяць пашырэнню духоўнай прасторы – усе разам і кожны паасобку»* [4, с. 8].

### Спіс літаратуры


1. *Максімовіч, В.* Традыцыя ў жыцці асобы і грамадства / В. Максімовіч // Полымя. – 2011. – № 4.

2. *Князев, А. М.* Модульное представление гражданственности / А. М. Князев // Научно-методические инновации в высшей школе / под общ. ред. проф. А. В. Макарова. – Минск: РИВШ, 2008. – 186 с.

3. *Барташэвіч, Г. А.* Этнапедагогіка беларусаў / Г. А. Барташэвіч // Вучэбна-тэматычны план і праграма праблемнага семінара. – Мінск: Ін-т павышэння кваліфікацыіі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі, 1996. – 26 с.

4. *Якабсон, А.* Духоўныя далягляды Гомельшчыны / А. Якабсон // Полымя. – 2010. – № 8.